УДК 327(47+438)«1921/1923»

# ПРАЦЭСЫ ДЭЛІМІТАЦЫІ І ДЭМАРКАЦЫІ САВЕЦКА-ПОЛЬСКАЙ МЯЖЫ Ў САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ 1921—1923 гг.

**Вольга Бароўская**

*Разгледжаны працэсы дэлімітацыі і дэмаркацыі беларускага ўчастка савецка-польскай мяжы ў Савецкай Беларусі 1921—1923 гг. Падкрэсліваецца, што праца Змешанай пагранічнай камісіі знаходзілася ў цеснай ўзаемасувязі з беларускімі кіруючымі органамі, у прыватнасці Саветам народных камісараў, Цэнтральным выканаўчым камітэтам, Народным камісарыятам земляробства, Народным камісарыятам працы БССР (ССРБ). Акцэнтуецца ўвага, што ўсе спрэчныя моманты ў працэсе дэмаркацыі савецка-польскай мяжы ў сваёй большасці былі звязаныя з незадаволенасцю мясцовых жыхароў, якія пратэставалі супраць адарвання пашаў, сенажацяў і лясных масіваў ад іх населеннага пункта і перадачы іх польскаму боку.*

*Ключевые слова: дэлімітацыя; дэмаркацыя; Змешаная пагранічная камісія; Народны камісарыят земляробства; Рыжскі мір; Савецкая Беларусь.*

***«Delimitation and Demarcation of the Soviet-Polish Border in Soviet Belarus (1921—1923)» (Volga Borovskaya)***

*The article examines the delimitation and demarcation of the Belarusian segment of the Soviet-Polish border in 1921—1923. It shows that the Joint Border Commission worked in close coordination with Belarusian governmental institutions, particularly the Council of People's Commissars, the Central Executive Committee, the People's Commissariat of Agriculture, and the People's Commissariat of Labour of the Byelorussian Soviet Socialist Republic (Socialist Soviet Republic of Byelorussia). The analysis reveals that disputes during the border demarcation process primarily stemmed from local opposition to the separation of pastures, hayfields and forests from settlements and their transfer to Polish control.*

*Keywords: delimitation; demarcation; Joint Border Commission; People's Commissariat of Agriculture; Soviet Belarus; Treaty of Riga.*

Пытанне аб усталяванні мяжы паміж Польшчай, з аднаго боку, Расіяй (і Беларуссю), Украінай — з другога, было адной з важных складаючых частак Рыжскага мірнага дагавора. Лінія дзяржаўнай мяжы была вызначана яшчэ Прэлімінарным мірным дагаворам, але яна патрабавала ўдакладненняў і правядзення па канкрэтнай мясцовасці з устаноўкай пагранічных знакаў. Дадатковым пратаколам ад 21 лютага 1921 г. было пацверджана, што прадугледжаная артыкулам I дагавора аб прэлімінарных умовах міра Змешаная пагранічная камісія (ЗПК) будзе створана адразу ж пасля заканчэння дэталёвага апісання дзяржаўнай мяжы, прыступіць да правядзення яе на месцы і ўстаноўкі пагранічных знакаў. Гэта пастанова была пацверджана і ў артыкуле II канчатковага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г. Гэты артыкул абавязваў кожны з бакоў, якія дамаўляліся, не пазней чым у чатырнаццацідзённы тэрмін пасля падпісання мірнага дагавора вывесці свае войскі і адміністрацыю з тых мясцовасцей, якія адышлі да іншага боку. Усё гэта патрабавала тэрміновага пачатку працы ЗПК, тым больш што ў шэрагу месцаў мяжа праходзіла праз населеныя пункты і ў мірным дагаворы не была вызначана іх прыналежнасць да таго або іншага боку. Шмат непаразуменняў узнікала з-за недакладнасці карт. Зацягванне ўстаноўленых тэрмінаў пагражала ўзнікненнем розных непаразуменняў і пагранічных канфліктаў, таму ў інтарэсах абодвух бакоў было патрэбна як мага хутчэй правесці гэтую працу.

Праблема выканання ўмоў Рыжскага мірнага дагавора і дзейнасці змешаных камісій раней не разглядалася ў гістарыяграфіі. У абагульняючых даследаваннях, прысвечаных гісторыі савецка-польскіх адносін міжваеннага часу, сустракаюцца адзінкавыя

*Аўтар:*
**Бароўская Вольга Мікалаеўна** — кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік цэнтра ўсеагульнай гісторыі, міжнародных адносін і геапалітыкі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, *e-mail: borovskaya-olga@mail.ru*
*Інстытут гісторыі Нацыянальная акадэміі навук Беларусі. Адрас: 1, вул. Акадэмічная, 1, Мінск, 220072, БЕЛАРУСЬ*

*Author:*
**Borovskaya Volga** — Candidate of History, Senior Researches at the Centre for General History, International Relations and Geopolitics, Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, *e-mail: borovskaya-olga@mail.ru*
*Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus. Address: 1, Akademicheskaya str., Minsk, 220072, BELARUS*

згадкі аб спецыфіцы працы камісій. Неабходна адзначыць напрацоўкі савецкага гісторыка П. Н. Альшанскага [4], польскіх спецыялістаў Е. Куманецкага [7] і В. Матэрскага [8], беларускага даследчыка В. М. Цынкевіча [5]. Пытанне ж узаемадзеяння кіруючых структур Савецкай Беларусі і дэлегацый змешаных камісій не было вылучана ў якасці самастойнага і дэталёва не вывучалася. Мэта артыкула — выявіць асаблівасці працэсу ўзаемадзеяння беларускіх савецкіх органаў кіравання і расійска-украінска-беларускай дэлегацыі ЗПК у 1921—1923 гг. па пытаннях дэлімітацыі і дэмаркацыі беларускага ўчастку савецка-польскай мяжы. Даследаванне ажыццяўлялася пры выкарыстанні спецыяльных гістарычных метадаў, прынцыпаў гістарызму і аб'ектыўнасці. Упершыню ўводзяцца ў навуковы зварот нарматыўна-прававыя дакументы Народнага камісарыята земляробства БССР (ССРБ), якія рэгламентавалі працэс збору картаграфічнага і статыстычнага матэрыялу, працэс дэмаркацыі савецка-польскай памежнай лініі. Рэканструкцыя працэсу адбываецца з выкарыстаннем архіўных і апублікаваных крыніц.

З мэтай удакладнення ўмоў Рыжскага мірнага дагавора, каардынацыі і кантролю іх выканання мясцовымі органамі ўлады прадугледжвалася стварэнне шэрагу змешаных камісій (пагранічнай, камісіі па рэпатрыяцыі, рээвакуацыйнай і спецыяльнай, разліковай, узгадняльнай камісіі па вырашэнні пагранічных канфліктаў). Пераважная большасць з іх засяроджвала сваю працу на тэрыторыі Савецкай Беларусі. Заканамерным з'яўлялася жаданне беларускага савецкага кіраўніцтва не толькі валодаць інфармацыяй аб іх дзейнасці, але і прымаць непасрэдны ўдзел у сумесных пасяджэннях камісій. 30 жніўня 1921 г. намеснік народнага камісара замежных спраў БССР А. Л. Бурбіс накіраваў намесніку наркома замежных спраў РСФСР М. М. Літвінаву і наркому замежных спраў Г. В. Чычэрыну лісты, дзе паставіў пытанне аб неабходнасці інфармавання і вырашэння праблем, якія датычацца Беларусі, непасрэдна з удзелам прадстаўнікоў БССР (ССРБ).

У складзе ЗПК не было прадстаўнікоў ад БССР (ССРБ), што прыводзіла да канфліктных сітуацый з мясцовым кіраўніцтвам з-за адсутнасці каардынацыі дзеянняў і ігнаравання інтарэсаў мясцовых жыхароў пры правядзенні дэмаркацыі. Народны камісарыят замежных спраў (НКЗС) БССР (ССРБ) неаднаразова ставіў пытанне аб уключэнні ў склад камісіі беларускіх прадстаўнікоў, але 10 мая 1921 г. НКЗС РСФСР у тэлеграме на імя старшыні Савета народных камісараў (СНК) БССР (ССРБ) А. Р. Чарвякова адмовіў яму ў гэтым, спасылаючыся на тое, што пагранічная камісія не мае да Беларусі ніякіх адносінаў, акрамя непасрэднай задачы правядзення мяжы. Тым не менш, улады БССР (ССРБ) усё ж дамагліся перайменавання 10 кастрычніка 1921 г. дэлегацыі ў расійска-ўкраінска-беларускую. 31 ліпеня 1922 г. пастановай сакратарыята ЦК КП (б)Б было вырашана ўвесці ў склад камісіі прадстаўніка ад БССР, «надаючы камісіі агульнасаюзны характар» [2, с. 175].

На сумесных пасяджэннях расійска-ўкраінска-беларускай і польскай дэлегацый ЗПК ажыццяўляўся працэс дэлімітацыі савецка-польскай мяжы, удакладнення агульнай канфігурацыі на аснове сабранага мясцовымі сіламі картаграфічнага і статыстычнага матэрыялу. Дэмаркацыя мяжы праходзіла дзякуючы намаганням мясцовых органаў кіравання, у прыватнасці Народнага камісарыята земляробства і Народнага камісарыята працы БССР (ССРБ), пры кантролі і каардынацыі з боку расійска-ўкраінска-беларускай дэлегацыі ЗПК, СНК і Цэнтральнага выканаўчага камітэта (ЦВК) БССР (ССРБ). Пры гэтым фінансаванне адбывалася за кошт рэспубліканскага бюджэту (Народнага камісарыята фінансаў БССР (ССРБ)).

ЗПК з расійска-ўкраінскага боку ўзначальваў С. С. Пясткоўскі, у склад уваходзілі таксама У. М. Ягор'еў, Ю. М. Ляшчынскі-Ленскі, І. А. Шамякін (сакратар) і некалькі дзясяткаў тэхнічных працаўнікоў. На чале польскай дэлегацыі знаходзіўся Л. Васілеўскі. Яе членамі былі Э. Малішэўскі, І. Матушэўскі, Л. Менджыевіч, К. Вышынскі (сакратар). Першапачатковым месцам працы ЗПК быў выбраны Мінск, які знаходзіўся геаграфічна блізка да плануемай мяжы і меў неабходныя тэлеграфічныя сродкі сувязі. 20 красавіка 1921 г. расійска-ўкраінская дэлегацыя прыбыла ў сталіцу БССР (ССРБ). Польская ж дэлегацыя, нягледзячы на дамоўленасць, прыехала туды толькі 1 мая. Пасля першага пасяджэння, якое адбылося 2 мая, польская дэлегацыя, спасылаючыся на неабходнасць правядзення кансультацый у Варшаве, запатрабавала зрабіць перапынак у працы на месяц. Вярнулася яна толькі ў канцы ліпеня. ЗПК складалася з Цэнтральнай (галоўнай) пагранічнай камісіі, якая знаходзілася ў Мінску. Яна ажыццяўляла кантроль і кіраўніцтва падкамісіямі, праводзіла мерапрыемствы па папярэджванні канфліктных сітуацый, вырашэнне спрэчных выпадкаў, перададзеных на разгляд з падкамісій. У сваю чаргу ў структуры вылучаліся мясцовыя падкамісіі: Полацка-Вілейская (Полацк), Мінска-Нясвіжская (Мінск, Нясвіж, Ракаў), Звягельска-Валынская (Роўна, Звягель), Палеская (Алевак, Лахва, пасля Лунінец) [1, ф. 122, воп. 4, спр. 79, арк. 14—17].

У справаздачы рэферэнта Усходняга аддзела Міністэрства замежных спраў (МЗС) Польшчы С. Залеўскага «Аб польска-савецкіх адносінах» ад 25 кастрычніка 1921 г. адзначалася, што праца ЗПК, створанай згодна з артыкулам II Рыжскага мірнага дагавора, з'яўляецца ў вышэй-

шай ступені незадавальняючай па прычыне негатыўнага стаўлення савецкага кіраўніцтва да пажаданняў польскага боку; пры размежаванні не ўлічваюцца эканамічныя інтарэсы; памежная лінія адрывае частку поля ад вёскі ці перасякае гасцінец, які ідзе ўздоўж мяжы. Расійска-ўкраінская дэлегацыя ЗПК не паказвала якіх-небудзь тэндэнцый да паразумення, у выніку праца дэлімітацыйнай камісіі вельмі марудна прасоўвалася наперад, нават у тых месцах, дзе мяжа ўжо была ўсталявана [6, s. 74].

15 лютага 1922 г. у рапарце старшыні польскай дэлегацыі ЗПК Л. Васілеўскага аб становішчы працы па дэлімітацыі савецка-польскай мяжы канстатавалася адсутнасць неабходных картаграфічных матэрыялаў у працэсе дэлімітацыі памежнай лініі, моцнае разыходжанне 10-вёрстнай і 3-вёрстнай карт. На першым этапе працы ЗПК адбываўся збор неабходных планаў і мясцовых карт, рознага матэрыялу для складання карт, якія адпавядалі б рэчаіснасці, высвятленне сацыяльнага і нацыянальнага становішча ў пагранічч. Збор гэтага матэрыялу павінен быў ажыццяўляцца ў ходзе сумеснай працы польскага і савецкага бакоў. У большасці выпадкаў неабходныя матэрыялы адсутнічалі і патрабавалась складанне новых [6, s. 128—132].

З мэтай збору «картаграфічнага, статыстычнага і іншага архіўнага матэрыялу аб населеных пунктах, зямельных угоддзях і прыватных уладаннях, аб лясах, балотах, рэках, азёрах», якія прылягаюць да дзяржаўнай мяжы, неабходных для працы ЗПК, у прыватнасці ў працэсе дэлімітацыі савецка-польскай мяжы, з ліку супрацоўнікаў Народнага камісарыята земляробства БССР (ССРБ) была складзена ініцыятыўная група. Яна павінна была «абследаваць архівы і матэрыялы ўстаноў, якія маюць да гэтага пытання датыкальнасць, менавіта: зямельных аддзелаў, губернскіх і павятовых статыстычных бюро, архівы былых дваранскіх і сялянскіх зямельных банкаў і матэрыялы, якія захоўваюцца ў адпаведных упраўленнях водных шляхоў і лесаўладкаванняў» [3, ф. 48, воп. 1, спр. 231, арк. 1]. У выніку была праведзена складаная праца па навуковай сістэматызацыі статыстычных данных аб этнаграфічным складзе памежных населеных пунктаў з указаннем колькасці жыхароў, двароў і падзелам па нацыянальнасцях, складзены падрабязны спіс населеных пунктаў і прыватна-ўладальніцкіх угоддзяў уздоўж мяжы. Былі сабраны статыстычныя даныя аб гаспадарчых уладаннях памежных населеных пунктаў (аб колькасці дзесяцін пахатнай зямлі, лугоў, лясоў, балот і прыватных уладальніцкіх угоддзях (фальваркі, маёнткі і г. д.)), выяўлены зямельныя карты і аграрныя планы адпаведных населеных пунктаў і прыватных уладальніцкіх угоддзяў, рознага кшталту гаспадарчыя акты, якія замацоўвалі права на землеўладанне і землекарыстанне (кадастры), звесткі аб пагранічных рэках, а таксама аб азёрах, балотах і інш. Ажыццяўлялася капіраванне інвентароў і планаў архіва землямерна-тэхнічнай часткі Народнага камісарыята земляробства БССР (ССРБ) памежных населеных пунктаў Барысаўскага, Слуцкага, Мазырскага, Мінскага паветаў [3, ф. 48, воп. 1, спр. 1103, арк. 2—9].

Па распараджэнні СНК БССР (ССРБ) лясны аддзел Народнага камісарыята земляробства 22 мая 1921 г. накіраваў тэлеграмы ў павятовыя лясніцтвы з просьбай прыступіць да абследвання прыгранічных лясных дач у паласе пяці вёрст ад мяжы з Польшчай, пачынаючы з поўначы на поўдзень. Павінны былі быць сабраны існуючыя планы ці складзены новыя. Акрамя асобных планаў неабходна было скласці агульны план прыгранічнай паласы з нанясеннем даследаваных дач. Таксама павінны быць прадстаўлены статыстычныя звесткі аб дачах (воласць, лясніцтва, найменне дачы, назва былога ўладальніка, агульная плошча лясных угоддзяў, ці дзеліцца дача мяжой, а калі дзеліцца, то шкода ад такога падзелу, парода, узрост, запас у дзесяцінах, апісанне угоддзяў, лясістасць мясцовасці, ці наладжаны збыт лесу, транспартныя ўмовы, наяўнасць і месца заводаў, якія перапрацоўваюць прадукты лясной гаспадаркі). Па магчымасці павінны быць таксама сабраны звесткі на захад ад мяжы на адлегласці пяці вёрст, але не пераходзячы пры гэтым мяжы. Указаныя планы і звесткі павінны быць прадстаўлены ў лясны аддзел не пазней 7 чэрвеня 1921 г. Дадаваліся анкетны ліст і чарцёж. У выніку большасць лясніцтваў не змаглі сабраць неабходны матэрыял (праз адсутнасць неабходных карт, планаў, схем, знішчаных падчас ваенных дзеянняў, сабраць новыя звесткі за шэсць дзён было складана) [3, ф. 48, воп. 1, спр. 231, арк. 21—22]. Дэталізацыя ўвагі на пытанні становішча лясных багаццяў Савецкай Беларусі, асабліва тых, што знаходзіліся ў памежнай паласе (так званыя лясныя дачы), тлумачыцца дастаткова частай з'явай вырубкі лясоў з боку прыватных уладальнікаў, якім «пагражае страта іх маёмасці ў выніку яе пераходу пад савецкую ўладу». Справа незаконнага вынішчэння лясных дач была ўзнята кіраўніцтвам Народнага камісарыята земляробства ў жніўні 1922 г. і перадана на разгляд ЗПК.

У справаздачы Усходняга аддзела МЗС Польшчы 3 жніўня 1922 г. адносна выканання Рыжскага дагавора ўказваліся цяжкасці ўсталявання памежнай лініі на полацка-вілейскім участку ад Арэхаўны да Радашковіч. Адбываліся двухтыднёвыя дыскусіі ў межах Полацка-Вілейскай падкамісіі ў Вілейцы аб прыналежнасці гідраўлічных збудаванняў на ст. Загацце (р. Вілія), зямель каля м. Лукавец, в. Цытавяны. Польскі бок прапаноўваў склікаць двухбаковую канферэнцыю ў Варшаве для вырашэння гэтага спрэчнага моманту.

На гэтую прапанову не быў атрыманы адказ ад савецкай дэлегацыі. Спрэчкі ўзнікалі і адносна тых тэрыторый, якія юрыдычна павінны былі адыходзіць да савецкага боку, аднак фактычна да моманту ўсталявання слупоў і памежных пунктаў з'яўляліся ў польскім падпарадкаванні [7, s. 205]. Складаным заставалася пытанне вызначэння канфігурацыі памежнай лініі на тых участках, дзе яна ішла ўздоўж рэк і дзе стваралася такая сітуацыя, што насельніцтва вёсак, якія адыходзілі да Польшчы, мела збудаванні на польскай тэрыторыі, аднак страчвала пашу і азёры, якія знаходзіліся на другім беразе рэк і адыходзілі да савецкіх дзяржаў (напрыклад, каля р. Случ, Корчык, Вязаўка і інш.). Так пытанне вызначэння мяжы на ўчастку р. Случ і Корчык польскай дэлегацыяй у паразуменні расійска-ўкраінска-беларускай дэлегацыяй было прадстаўлена НКЗС РСФСР, аднак не атрымала станоўчага вырашэння. Восем вёсак Ленінскай гміны былі аддзелены ад сваіх пашаў і сенажацяў. Цяжкім для вырашэння было пытанне аб участках каля чыгуначных станцый Загацце — Аляхновічы, Коласава, а таксама аб некалькіх вёсках на самым пагранічны (Сверынава (Стаўбцоўскі р-н), Будкі Вайтковіцкія (Столінскі р-н) і інш.).

Наступнай стадыяй было правядзенне межавання і дэмаркацыі на аснове інструкцый, распрацаваных Міністэрствам грамадскіх прац і Вайскова-геаграфічным інстытутам Польшчы, Корпусам ваенных тапографаў Чырвонай Арміі. Гэты працэс адбываўся паралельна з працэсам заслупоўвання мяжы. Уся праца тэхнічнага характару (выдзяленне лясных матэрыялаў для загатоўкі пагранічных слупоў, гужавых падвод для іх транспарціроўкі, рабочай сілы — мясцовых сялян) ажыццяўлялася за кошт мясцовых органаў кіравання. Так, 18 красавіка 1922 г. ЦВК БССР (ССРБ) звяртаўся ў Народны камісарыят працы БССР (ССРБ) з просьбай аб аказанні садзейнічання ЗПК пры перавозцы пагранічных слупоў з рэзалюцыяй старшыні СНК А. Р. Чарвякова, пры тэрміновай выдачы распараджэння адпаведным паветам аб аказанні поўнага садзейнічання Полацка-Вілейскай падкамісіі з прадстаўленнем неабходнай працоўнай гужавой сілы [3, ф. 6, воп. 1, спр. 18, арк. 35]. 25 лютага 1922 г. старшыні СНК БССР А. Р. Чарвякову паступіў ліст ад расійска-ўкраінска-беларускай ЗПК аб складанасцях, якія ўзнікалі пры падрыхтоўцы пагранічных слупоў. Упаўнаважаны па пытаннях аб нарыхтоўцы слупоў т. Сідараў прасіў аплату — 30 фунтаў мукі па рынačным кошце за кожны слуп. У сваю чаргу расійска-ўкраінска-беларуская дэлегацыя ЗПК патрабавала указаць мясцовым лясным упраўленням на неабходнасць аказання дапамогі ў вырашэнні гэтай справы [3, ф. 6. воп. 1. спр. 18. арк. 53]. У сакавіку 1922 г. намеснік старшыні СНК БССР (ССРБ) І. А. Адамовіч прадпісваў пагранічным валасным камітэтам Барысаўскага і Мінскага паветаў аказваць Полацка-Вілейскай падкамісіі энергічнае садзейнічанне па нарыхтоўцы і развозцы слупоў згодна з прапанаванай схемай: в. Вялікая Чарніца — 50 слупоў, в. Далёкая — 50 слупоў, м. Крайск — 100 слупоў, м. Радашковічы — 100 слупоў [3, ф. 6, воп. 1, спр. 18, арк. 49].

У працэсе дэмаркацыі савецка-польскай мяжы ўзнікалі складанасці, выкліканыя непаразуменнямі прыватнага характару (збор ураджаю на сенажацях і пашах, якія апынуліся па другі бок мяжы, эвакуацыя маёмасці, вырубка лясоў). Супрацоўнікі абедзвюх дэлегацый ЗПК вымушаны былі ўлічваць запатрабаванні мясцовага насельніцтва, якое ў сваёй большасці выказвала незадавальненне працэсам дэмаркацыі, разглядаць справы аб аддзяленні пасяўных і пашавых тэрыторый ад населеных пунктаў. Найбольш спрэчныя пытанні былі перададзены на разгляд Змешанай узгадняльнай камісіі па вырашэнні пагранічных інцыдэнтаў, праца якой таксама знаходзілася ў непасрэднай сувязі з працай органаў кіравання Савецкай Беларусі. Так, 27 ліпеня 1921 г. на пасяджэннях ЗПК было прынята кампраміснае рашэнне адносна засявання пашаў, дзяржаўная прыналежнасць якіх яшчэ не была дакладна вызначана. Было вырашана, што на ўчастках, дзе дзяржаўная мяжа была ўсталявана, распахана, а слупы і пункты памежнай аховы ўжо замацаваны, абодва бакі гарантавалі права на збор ураджаю тым, хто распахаў зямлю, незалежна ад таго, дзе знаходзіўся той надзел на ўсход або на захад ад усталяванай памежнай лініі. 1 кастрычніка 1921 г. на IV пасяджэнні Полацка-Вілейскай падкамісіі была прынята пастанова аб дазволе «ўзаемна да часу правядзення канчатковай дзяржаўнай мяжы апрацоўкі і засева гаспадарчых адзінак, падзеленых часовай мяжой, асобам, якія маюць на тое права па законах той дзяржавы, дзе знаходзіцца гаспадарчы цэнтр». Пры гэтым абодва бакі гарантавалі, што збор ураджаю адбудзецца «без абкладання і адчужэння». Прадугледжвалася свабоднае перамяшчэнне ў памежнай паласе [3, ф. 48, воп. 1, спр. 288, арк. 88]. З 8 лістапада 1921 г. ЗПК прыступіла да разбору спраў, якія датычыліся задавальнення прад'яўленых патрабаванняў аб кампенсацыі страт жыхарам памежнай паласы, земля якіх была не засеяна ці ўраджай з якой быў патраўлены ці ўбраны ў выніку забароны ўладай аднаго з бакоў. 6 лістапада 1921 г. расійска-ўкраінска-беларуская дэлегацыя Палескай падкамісіі ў Жыткавічах прасіла тэрмінова даслаць ёй спісы пацярпелых землеўладальнікаў Мінскай губерні [3, ф. 48, воп. 1, спр. 1095, арк. 66—68].

18 мая 1922 г. адміністрацыйна-арганізацыйнае ўпраўленне Народнага камісарыята земляробства БССР (ССРБ) паведамляла Мазырскаму, Мінскаму, Слуцкаму, Барысаўскаму

павятовым зямельным ўпраўленням, што «па звестках НКЗС назіраюцца выпадкі, калі прадстаўнікі органаў савецкай улады памежнай паласы, падрыхтоўваючы да эвакуацыі населены пункт, які згодна з рашэннямі ЗПК адыходзіў да Польшчы, аддаюць загады да вывазу сельскагаспадарчага інвентару, які з'яўляецца маёмасцю жыхароў гэтага пункта, а таксама ўчыняюць вырубку ці раскраданне лясоў, злом жылых пабудоў і інш. Такая з'ява вельмі непажаданая, бо выклікае празмерныя канфлікты з палякамі і справядлівыя папрокі з боку сялян, якія сілай абставін зрабіліся польскімі грамадзянамі». Факт масавага вывазу сялянскай маёмасці меў месца ў в. Шчэпкі (каля Радашковіч) і па гэтай прычыне быў заяўлены пратэст у НКЗС з боку польскай дэлегацыі змешанай камісіі па пагранічных інцыдэнтах. Зыходзячы з вышэй выкладзенага Прэзідыум ЦВК РСФСР 29 красавіка 1922 г. прасіў ЦВК БССР (ССРБ) звярнуць на гэта сур'ёзную ўвагу і растлумачыць падведамственным органам пагранічнай паласы, што вывазу з вызваленых сяленняў падлягае толькі маёмасць і інвентар савецкіх гаспадарак, а не інвентар, які з'яўляецца маёмасцю сялян населеных пунктаў, якія адышлі да Польшчы [3, ф. 48, воп. 1, спр. 1569, арк. 78].

10 снежня 1923 г. у справаздачы Усходняга аддзела МЗС Польшчы, паданага міністру замежных спраў па пытаннях, звязаных з выкананнем Рыжскага мірнага дагавора, паведамлялася аб заканчэнні працы ЗПК і падпісанні 23 лістапада 1923 г. пратакола аб перадачы адміністрацыйным уладам польскага і савецкага бакоў цалкам заслуплёнай і вызначанай памежнай лініі; працы па складанні межавых планаў павінны былі быць завершаны ў снежні 1923 г., як і абмен імі [6, s. 347—348].

Працэсы дэлімітацыі і дэмаркацыі беларускага ўчастку савецка-польскай мяжы ў 1921—1923 гг. праходзілі пры цесным узаемасупрацоўніцтве беларускіх савецкіх органаў кіравання з дэлегацыямі ЗПК, пачынаючы ад этапу па зборы картаграфічнага і статыстычнага матэрыялу, дэталізацыі канфігурацыі памежнай лініі, межавання і заканчваючы працамі па заслупленні мяжы. З беларускага боку агульнае кіраўніцтва справай тэрытарыяльнага размежавання ажыццяўлялася праз Савет народных камісараў, Цэнтральны выканаўчы камітэт, Народны камісарыят земляробства, Народны камісарыят працы, Народны камісарыят фінансаў БССР (ССРБ), на месцах — пад кантролем павятовых выканаўчых камітэтаў. У працэсе дэмаркацыі беларускага ўчастка савецка-польскай мяжы ўзнікалі спрэчныя моманты. Яны былі звязаны з актыўным пастуленнем запытаў ад мясцовага насельніцтва аб захаванні права валодання пашамі, сенажацямі іляснымі масівамі, якія згодна з умовамі дагавора адыходзілі польскаму боку.

## Спіс выкарастаных крыніц


1. Архив внешняй политики Российской Федерации.
2. Знешняя палітыка Беларусі: зб. дак. і матэрыялаў. У 10 т. Т. 2: 1923—1927 гг. / склад.: У. М. Міхнюк, У. К. Ракашэвіч, Я. С. Фалей, А. В. Шарапа. — Мінск, 1999. — 461 с.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.
4. Ольшанский, П. Н. Рижский договор и развитие советско-польских отношений. 1921—1924 гг. / П. Н. Ольшанский. — М.: Наука, 1974. — 286 с.
5. Цынкевіч, В. М. Палітычныя ўзаемадачыненні паміж БССР і Польскай Рэспублікай у 1921—1929 гг.: дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.15 / Цынкевіч Валерый Мікалаевіч; БДУ. — Мінск, 2004. — 127 л.
6. Dokumenty do historii stosunków polsko-sowieckich 1918—1945 / red. serii M. Wołos. — T. I: 1918—1926. — Cz. 2: Poszukiwanie normalizacji (kwiecień 1921 — maj 1926). — Warszawa: Centrum Polsko-Rosyjskiego Dialogu i Porozumienia, 2020. — 950 s.
7. Kumaniecki, J. Po traktacie ryskim: stosunki polsko-radzieckie: 1921—1923 / J. Kumaniecki. — Warszawa: Książka i wiedza, 1971. — 281 s.
8. Materski, W. Polska a ZSSR: 1923—1924: stosunki wzajemne na tle sytuacji politycznej w Europie / W. Materski. — Wrocław: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1981. — 380 s.


Артыкул паступіў у рэдакцыю 6 сакавіка 2025 г.